*Конкурс!*

**«100 гадоў з дня нараджэння Міхася Васілька»**



вайны. Вярнуўшыся з бацькамі на радзіму – Міхась у Баброўню каля Скідзеля, а Пётр у Скідзель, далучыліся да змагання супраць акупацыі Заходняй Беларусі панскай Польшчай. Абодва актыўна працавалі ў скідзельскім гуртку Таварыства беларускай школы, які ўзначальваў Пётр, ладзілі розныя мерапрыемствы. Мая цётка Маруся, родная сястра Пятра, не раз узгадвала, расказвала мне пра сяброў-паэтаў, паэтаў-змагароў. Запомніўся ёй «паход» з Пятром у Баброўню, за сем кіламетраў ад Скідзеля, дзе яны наладзілі вечарыну. Сабралася ў адрыне шмат народу і з суседніх вёсак. Пасля спектакля Міхась чытаў свае вершы. Быў ён у даматканай вопратцы, босы.

Але духам нязломны. Пётр у чаў працаваць у рэдакцыі «Гродзенскай праўды» літкансультантам. У канцы таго ж года ў газеце быў надрукаваны першы мой верш.

Пасля я нямала сустракаўся з Міхаілам Восіпавічам.

Працуючы літкансультантам, Васілёк уважліва ставіўся да маладых літаратараў. На пасяджэнні абласнога літаратурнага аб'яднання заўсёды запрашаў і мяне. Тут я ўпершыню сустрэўся з Петрусём Макалём, з ім сябраваў да канца яго дзён. Васілёк пазнаёміў мяне з Янкам Брылём, сяброўства з якім доўжыцца больш як паўвека. Пазнаёміўся з многімі журналістамі «Гродзенскай праўды», асабліва прыязныя адносіны склаліся з Аляксандрам Кіркевічам. У гэтай газеце надрукаваныя

# «П'е асалоду душа»

З усіх беларускіх паэтаў для мяне самы блізкі – Міхась Васілёк. Нічыя творчасць не спалучана так з маёй радзімай, як яго. Калі агортвае сум па родных мясцінах, бяру з паліцы яго кнігу «Зоры над Нёманам». Углядаюся ў знаёмыя рысы твару аўтара – і нібы бачу яго жывога. Нібы чую яго голас, глухаваты, крыху асіплы. І неаднойчы чытаныя радкі ўспрымаюцца па-новаму, свежа, хвалююча. Ледзь не ў кожным вершы бачу сапраўдныя падзеі, рэальных людзей, дарагія мне мясціны, пейзажы. А прачытаю, перагарну апошнюю старонку – і зашчыміць сэрца, бо

*Ціхага шчасця ўспаміны*
*Перада мною ўсплылі.*

Яшчэ з дзяцінства помняцца мне сямейныя вечары паэзіі ў дзедавай хаце.

— А што піша наш Васілёк? – гаварыў дзед Якуб, хаваючы ўсмешку ў кароткія калючыя вусы, гартаючы папулярны ў Заходняй Беларусі часопіс «Маланка». – Ага, вось. Слухайце:

*Эх, гарэліца мая,*
*Што ты выглядаеш?*
*Ты над намі, мужыкамі,*
*Літасьці не маеш.*

І ўсе, хто слухаў, — мая маці, браты яе Валодзя, Іван, Міхась, бабка Юля, паміралі ад смеху.

Дзед адкладваў падшыўку часопіса, хмыкаў у вусы:

— А цяпер – як я пана перанёс.

І пачынаў чытаць гэты верш на памяць. Зноў было рогату. Усе радаваліся з таго, як хітры мужык паздзекаваўся з прадстаўніка панскай улады – паліцыянта: выкупаў яго ў рацэ Котра.

З Васільком дружыў сын дзеда Якуба – Пётр Сяўрук, таленавіты паэт, які рана памёр – у 1929 годзе. Былі яны аднагодкі, Пётр нарадзіўся 12 ліпеня, Міхась – 14 лістапада. Пабылі падчас Першай сусветнай вайны ў бежанстве ў Расіі, там вучыліся, там дыхнулі паветрам рэвалюцыі і грамадзянскай вершы «Міхею Васільку» пісаў:

*У вашых вершах многа смеху,*
*Але й шмат таксама жалю*
*Па сваёй старонцы роднай,*
*Што гібее пад цяжарам*
*Злой нядолі.*
*З грудзей рвецца*
*крык пратэсту*
*Разам з заклікам к змаганню,*
*Бо душа баліць і рвецца*
*Ад балючага жадання*
*Лепшай долі.*
*Гэту боль я разумею,*
*Бо не раз быў ёй прыбіты.*
*І не раз гарэў надзеяй*
*Шлях знайсці*
*да светлай мэты –*
*Вызвалення.*

Гэты шлях Міхась Васілёк бачыў у змаганні супраць акупантаў. Гэтым шляхам пайшоў і мой бацька, які таксама пасябраваў з Міхасём. Міхаіл Восіпавіч бываў і ў нашай хаце. Таму, калі я пачаў пісаць вершы і захацеў паказаць іх сапраўднаму паэту, успомніў пра Міхася Васілька. Было гэта ў 1949 годзе.

Ён даволі падрабязна разгледзеў мае вершы. Тлумачыў, чаму гэты радок паэтычны, а гэты – не, чаму адзін верш лепшы, а іншы не ўдаўся. Голас у яго быў глухаваты, спакойны. Гаварыў няспешна. Раіў, што і як падправіць. Яго дружалюбнасць, добразычлівасць супакоілі мяне, знікла тое прыкрае пачуццё, калі адчуваеш, што нешта зрабіў не так.

Я атрымаў ад Міхася Васілька выдатны ўрок. Урок таго, як належыць паважаць слова, як трэба працаваць над ім, літаральна над кожным.

На развітанне Міхась Восіпавіч гаварыў:

— Пішы смялей, не саромся пачуццяў, давай ім волю. Лірыка патрабуе шчырасці, сардэчнасці. Прыязджай калі з новымі вершамі, пагутарым. Мы ж з тваім бацькам былі дружбакі. Шкада Ваню...

Неўзабаве Міхась Васілёк па- першыя мае карэспандэнцыі, першы верш, першае апавяданне. Так што з поўным правам магу сказаць: Міхась Васілёк адкрыў для мяне дарогу ў журналістыку і літаратуру.

Прыязджаючы на радзіму, заўсёды бываю ў мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Міхаіла Восіпавіча. Тут яго, як гаворыцца, памятае кожны камень, тут жылі і жывуць людзі, якія ведалі яго, сябравалі з ім. Паэт бываў у многіх дамах скідлян. Шэраг падзей, выпадкаў, фактаў ляглі ў радкі вершаў.

У Бандарах сустрэўся з дваюраднай сястрой паэта Ф.І. Самойла, якая, на жаль, пайшла з жыцця. Яе вершы друкаваліся ў «Гродзенскай праўдзе», «Літаратуры і мастацтве». Фаіна Ігнатаўна цёпла ўспамінала брата. У яе я ўбачыў кнігі Васілька – і «Шум баравы», і «З сялянскіх ніў». І якой дарагой даўнінай павеяла ад іх. Якімі дарагімі здаліся мне пажоўклыя старонкі, што захавалі пачуцці, думы, мары чалавека, што выспелі вось на гэтай зямлі, сярод яе людзей.

... Возера Можнева ляжала спакойнае, ціхае. Высокі трыснёг ледзь калыхаўся. Густая трава ўкрыла берагі. Кусты і рэдкія дрэвы глядзелі ў люстраную ваду. Як тут было не згадаць верш паэта пра гэтае азерца. Вось яно, перада мною.

*Спяць векавечныя хвоі,*
*Цёмнае возера спіць,*
*Толькі ў дуброве часамі*
*Дзіка сава пракрычыць.*
*Потым ізноў супакоем*
*Дыхае з сонных імшар,*
*Сэрца ў грудзях замірае,*
*П'е асалоду душа.*

Як жа сугучныя гэтыя радкі з маімі пачуццямі. Сэрца маё замірае ад сустрэчы з зямлёй Васілька, маёй цудоўнай Скідзельшчынай. І душа п'е асалоду, калі чытаю яго паэзію.

**Мікола ДЗЕЛЯНКОЎСКІ.**